**Нормы беларускай літаратурнай мовы: тэставыя заданні**

**Ірына Уладзіміраўна Цімохава,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
гімназіі г. Быхава

**Дадзены трэнажор складаецца з 20 заданняў у выглядзе тэстаў, якія прызначаны для адпрацоўкі ўменняў і навыкаў па тэме “Нормы беларускай літаратурнай мовы”. Матэрыял можна выкарыстоўваць на ўроках беларускай мовы, факультатыўных занятках, а таксама для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага экзамену (цэнтралізаванага тэсціравання).**

1. Адзначце словазлучэнні, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:
   1. два вялікія магазіна
   2. экскурсіі па нядзелях
   3. цямней хмары
   4. клапаціцца аб слабых
   5. адправіць на адрас

2. Адзначце словазлучэнні, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:
   1. насміхацца над няўмекам
   2. чорная сабака
   3. хварэць на ангіну
   4. падобная да маці
   5. за сто крокаў ад прыпынка

3. Адзначце словазлучэнні, якія не адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:
   1. дзве пятых ураджаю
   2. расфасаваць па пакетах
   3. паслаць за бацькам
   4. дараваць сябру
   5. зроблена па ўзору

4. Адзначце словазлучэнні, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1. сухія голлі
2. шчодры на пахвалу
3. схадзілі за кавай
4. малады ўрач Кавалёва
5. забыцца на абяцанне

5. Адзначце словазлучэнні, якія не адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1. збірацца ў лес
2. заляцацца к суседкі
3. плысці па марам
4. тры дня
5. разважаць пра будучыню

6. Адзначце словазлучэнні, правільна перакладзеныя на беларускую мову:

1. подплыть к озеру – падплысці да возера
2. они дружнее нас – яны дружней нас
3. женился на Марине – ажаніўся на Марыне
4. удивляться погоде – дзівіцца надвор’ю
5. определить по вкусу – вызначаць на смак

7. Адзначце словазлучэнні, правільна перакладзеныя на беларускую мову:

1. гуляць по улицам – гуляць па вуліцам
2. извините меня – выбачайце мне
3. приехать через год – прыехаць цераз год
4. сходить за черникой – схадзіць у чарніцы
5. скучать по причине – сумаваць з прычыны

8. Адзначце словазлучэнні, няправільна перакладзеныя на беларускую мову:

1. зайти за молоком – зайсці за малаком
2. дорожная пыль – дарожная пыль
3. топить печь – тапіць печ
4. выше отца – вышэй за бацьку
5. горячие угли – гарачае вуголле

9. Адзначце словазлучэнні, правільна перакладзеныя на беларускую мову:

1. сваренная крупа – звараная крупа
2. четыре новых тетради – чатыры новых сшыткі
3. сбегать за яблоками – збегаць па яблыкі
4. оба брата – абодва браты
5. дом в пять этажей –дом у пяць паверхаў

10. Адзначце словазлучэнні, правільна перакладзеныя на беларускую мову:

1. ходить по полям – хадзіць па палях
2. благодарить учителя – дзякаваць настаўніка
3. забота о здоровье – клопат пра здароўе
4. говорить о событиях – гаварыць аб падзеях
5. дальше всех – далей за ўсіх

11. Адзначце словазлучэнні, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1. трое жанчын
2. спелыя суніцы
3. загадчыца склада
4. звярнуцца на адрас
5. сумаваць аб сястры

12. Адзначце словазлучэнні, якія не адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1. уваход па білетам
2. ведала пра гэта
3. смяяцца з сябра
4. дзве пятыя плошчы
5. падсохлыя насенні

13. Адзначце словазлучэнні, якія не адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1. матэматычны дроб
2. паехаць за сенам
3. ажаніцца на суседцы
4. малады інжынер Валянціна Шпак
5. даглядаць дзядулю

14 Адзначце словазлучэнні, якія  адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1. начны цень
2. сустракацца па панядзелкам
3. стаяць у стала
4. бачыць на свае вочы
5. абодва студэнты

15. Адзначце словазлучэнні, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1. тры веласіпеды
2. дзівіцца  з унука
3. раскласці па палічкам
4. саладзей мёду
5. паслаць па дапамогу

16. Адзначце сказы, у якіх ёсць спалучэнні, што не адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1. Бабуля, пойдзем заўтра ў маліны?
2. З-за цябе мы спазніліся сёння ў тэатр.
3. У нашым садзе выраслі тры вялікіх грушы і дзве яблыні.
4. Трое студэнтаў накіраваны  на аўтамабільны завод.
5. Валін брат працуе загадчыкам над клубам у нашай вёсцы..

17. Адзначце сказы, у якіх спалучэнні адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1. Я не хацеў вас пакрыўдзіць, выбачайце мне.
2. Цэлыя тры гады мы не бачыліся з сяброўкай.
3. Гэтай зімой бабуля моцна хварэла грыпам і доўга ляжала ў бальніцы.
4. У хату ўвайшлі чатыры незнаёмыя чалавекі.
5. Матуля папрасіла Міхася збегаць у краму за малаком.

18. Адзначце сказы, у якіх ёсць спалучэнні, што не адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1. Маці адправіла дачку па бацьку, які сек дровы на двары.
2. Міколка не паспеў падрыхтавацца к заняткам.
3. Больш дзесяці год Андрэй займаецца спортам.
4. Гады праз два Алесь ажаніўся з аднакурсніцай Машай.
5. Аўтобус прыходзіў тры разы ў тыдзень.

19. Адзначце сказы, у якіх  спалучэнні адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1. Над крутым берагам Нёмана стаяць тры высокія дубы.

2. Сын ва ўсім быў падобны да бацькі.

3. Марыся нікому не паскардзілася: не хацела, каб над ёю смяяліся людзі ў вёсцы.

4. Малады аграном Андрэева Святлана да працы адносілася адказна.

5. Гэтае смачнае яблыка, што дала мне бабуля,  так і хацелася адразу з’есці.

20. Адзначце сказы, у якіх ёсць спалучэнні, якія не адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1. Стаіўшыся ў сваім пакойчыку, Максім стаяў ля акна і дзівіўся з надвор’я.

2. Дзве пятыя соткі бабулінага гарода былі засаджаны буракамі.

3. Вясёлая і ўзбуджаная Ганна хадзіла па пакоям  кватэры і расказвала пра сустрэчу з аднакласнікамі.

4. Жоўтае лісце засцілала зямлю, утвараючы рознакаляровы дыван.

5. Алеся паспешліва падзякавала сяброўку, развіталася з усімі і выскачыла з клуба.

**АДКАЗЫ**

**1. 2,5**
**2. 3,4,5**
**3. 1,3,5**
**4. 2,4,5**
**5. 2,3,4**
**6. 1,5**
**7. 2,4,5**
**8. 1,2,3**
**9. 3,4**
**10. 1,3,5**
**11. 2,3,4**
**12. 1,5**
**13. 2,3**
**14. 1,4,5**
**15. 1,2,5**
**16. 2,3,5**
**17. 1,4**

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ
ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**18. 2,3,5**
**19. 1,2,4**
**20. 3,5**

## Літаратура

Инструктивно-методическое письмо Министерства образования Республики Беларусь «Об организации в 2025/2026 учебном году образовательного процесса при изучении учебных предметов и проведении факультативных занятий при реализации образовательных программ общего среднего образования». Дадатак 2. Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура».

NG PRESS ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА